Часопіс жанчын Беларусі

АЛЕСЯ

ISSN 0131-8055

№ 6 ■ 2020

Работніца і сялянка

Вольга Костэль.

Харэограф, які бачыць у танцы паэзію

Ироническая драма по мотивам романа А.С.Пушкина

Спектакль, наполненный завораживающей музыкой струнного квартета и экспрессивной игрой на саксофоне Игоря Бутмана, - удивительно эмоционален. Здесь все нереально и... реально: и декорации, и свет, и шум дождя на сцене, и звуки бездыханных инструментов…



Радзіва «Прудок»

Спектакль

24 июня

19:00

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

г. Минск
ул. Энгельса, 7

Алеся

6/2020

РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

ШТОМЕСЯЧНЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС (ДЛЯ ЖАНЧЫН)

ВЫДАЕЦЦА З ЛІСТАПАДА 1924 г.
МАТЭРЫЯЛЫ ДРУКУЮЦЦА
НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ
ВЫХОДЗІЦЬ АДЗІН РАЗ НА МЕСЯЦ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз жанчын".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 1140 ад 28.10.2014, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

ВЫДАВЕЦ:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом "Звязда"

Дырэктар – галоўны рэдактар
Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Шэф-рэдактар
Ларыса Паўлаўна РАКОЎСКАЯ

Адрас рэдакцыі
Юрыдычны адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
Тэл./факс: 8 (017) 287-19-19

Паштовы адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
e-mail: *alesya@zviazda.by*
Сайт: *zviazda.by/be/edition/alesya.by*
Тэл.: 8 (017) 287-16-29, 287-17-59, 287-17-35

Падпісныя індэксы:
індывідуальны – 74995
ведамасны – 749952

Мастацкі рэдактар, камп'ютарная вёрстка Т. А. МАЛЬКО

Стыль-рэдактар К. М. БАНДУРЫНА

Падпісана да друку 01.06.2020 г.
Фармат 60x84 1/8.
Гарнітура "Georgia".
Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 6,51.
Ул.-выд. арк. 8,45.
Тыраж 1163 экз. Зак. №

На вокладцы:
балетмайстар Вольга КОСТЭЛЬ.
Фота: Аніка Нядзелька.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком ®, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "БудМедыяПраект",
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 г.
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

12+

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2020
© Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз жанчын", 2020

ЧЫТАЙЦЕ

ГОСЦЯ РЭДАКЦЫІ

Вольга БАБУРЫНА: «Выцінанка — новае жыццё народнага мастацтва» 2

ЖАНЧЫНА ГОДА

Святлана ДЗЯТКО: «Цешуся поспехамі нашых выхаванцаў» 6

АКЦИИ

Марафон поддержки 9

ПРАЕКТЫ

Знайдзіся, дзіця!
«Любіць нескладана, калі ўсё добра» 10

ПЕРСОНА

Ольга КОСТЕЛЬ: «Когда не хватает слов, начинается танец...» 12

ПСИХОЛОГИЯ

Быть собой-2 18

ГОСТЬ РЕДАКЦИИ

Ксения ФЁДОРОВА: «Важный компонент счастья – свобода выбирать себе жизнь» 20

Виталий Чернобрисов: «Пусть дети бесконечно рисуют!» 24

СПАДЧЫНА

Ларыса МЯТЛЕЎСКАЯ. У гародзе лебяда – гаспадыні не бяда. Гатуем стравы з пустазеллем 28

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Чаго хочуць жанчыны? Быць паспяховымі! 31

ТЭМА

Сакрэтны код ДНК 34

ВКУС ЖИЗНИ

Майстэрня. Пэчворк у інтэр'еры 38

Увлечения. Яркие идеи 41

Здоровье. Без выраженных симптомов. Что должна знать каждая женщина? 42

Мы выбираем, нас выбирают... Как найти «своего» мастера по красоте 44

Стиль. Золотые правила красоты 46

Секреты. Что в имени тебе моём? 48

ЖЕНСКАЯ ИСТОРИЯ

Валентина БЫСТРИМОВИЧ. Бедная Настя 50

Вольга Бабурына: «Выцінанка — новае жыццё народнага мастацтва»

Выцінанка з'явілася на Беларусі ў часы Вялікага княства Літоўскага. Першымі яе ўзорамі лічацца кустодзіі — папяровыя накладкі пад сургучныя пячаткі. Больш шырокае распаўсюджанне выцінанкі пачалося ў часы, калі папера стала даступным матэрыялам. Ажурныя ўпрыгожанні з задавальненнем рабілі як жанчыны са шляхты, так і сялянкі.

Мастацтва выцінанкі патрабуе ўважлівага погляду на свет, умення бачыць і яго драбнюткія дэталі, і ўніверсальныя сімвалы, у метафарычнай форме адлюстроўваць жывую повязь часоў. Такім поглядам на свет валодае наша госця — народная майстрыха, загадчыца секцыі выцінанкі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Вольга БАБУРЫНА, у творчым асяродку вядомая як Palunisa.

— У мінулым стагоддзі ў Беларусі ў міжваенны перыяд і першае пасляваеннае дзесяцігоддзе прынята было ўпрыгожваць выцінанкамі хату да свят, — успамінае Вольга. — Мая маці, як многія ў савецкія часы, на Каляды выразала сняжынкі, мы прымацоўвалі іх да аконных шыбаў, падвешвалі пад столлю. Гэта прыклад выкарыстання выцінанкі ў гарадскім асяроддзі. У вёсцы мая бабуля выразала ўзоры з гафрыраванай паперы і ўпрыгожвала імі драўляныя скрыні. Элементы папяровага дэкору прысутнічалі і на абразах. А бабуліна сястра рабіла выбіванкі: брала гільзы ад куль розных калібраў і стварала пры дапамозе дзірачак ад іх аздабленне для хаты.

На жаль, папера — недаўгавечны матэрыял для выкарыстання ў інтэр'еры, бо хутка губляе свае якасці. Да наступнага свята папярэдняе ўпрыгожанне проста палілі ў печы і рабілі новае. Так заканчваўся жыццёвы цыкл выцінанкі. Праз гэта шмат артэфактаў проста знікла. Ды выцінанка і не лічылася відам мастацтва, пакуль не трапіла з бытавога асяродку ў сферу зацікаўленасці прафесійных мастакоў. Вось тады і пачаўся сапраўдны яе росквіт.

Цяпер у розных краінах праводзяцца семінары, канферэнцыі, звязаныя з выцінанкай. Актыўна вывучаецца яна ў Расіі, Украіне, Нямеччыне, Літве, Польшчы і, вядома, у Беларусі. Шэсць сімпозіумаў па выцінанцы прайшло ў Маскве. У Маладзечне, дзе я жыву, сёлета ў другі раз запланаваны Міжнародны сімпозіум па выразанні з паперы. Перад Калядамі адбыўся семінар-практыкум па выцінанцы, яго зладзілі педагогі аддзялення

Алена ГАРШКОВА
Фота з архіва
Вольгі БАБУРЫНАЙ

дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Маладзечанскага музычнага каледжа імя Агінскага. Зацікаўленыя людзі абменьваюцца досведам, знаходкамі. Выцінанка жыве, вывучаецца, набывае новых прыхільнікаў.

— Як і калі вы зацікавіліся выцінанкай?

— Падчас маёй вучобы ў мастацкай школе ў Маладзечне дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва ў нас вяла Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава, педагог ад Бога. Яна пачала займацца адраджэннем выцінанкі, і я была адной з першых вучаніц, з кім яна гэта рабіла. У 90-я гады, пасля вучобы ў Мірскім вучылішчы, я вярнулася ў Маладзечна, прыйшла ў клас народнага мастацтва для дарослых, дзе выкладала Вікторыя Мікітаўна, і зноў сустрэлася з выцінанкай. Выразанне з паперы пачало займаць усё больш месца ў маім жыцці. Узораў для пераймання не было, што сталася да лепшага, бо майстрыхі, якія разам са мной выйшлі з маладзечанскай школы выцінанкі, маюць свой почырк. Да гэтага часу ў Маладзечанскім музычным каледжы імя Агінскага выцінанка выкладаецца. У 1997 годзе я ўступіла ў Саюз майстроў народнай творчасці, на той час я ўжо ўдзельнічала ў выставах, конкурсах, мела калекцыю работ і сфарміравалася як мастачка ў тым, што тычыцца выцінанкі.

— Як кожнае адметнае народнае мастацтва, выцінанка звязана з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Заўважна, што вы выкарыстоўваеце ў сваіх работах матывы беларускага фальклору, вобразы-сімвалы дрэў, птушак, каранёў. Ці ёсць у вас улюбёныя вобразы, праз якія вы выяўляеце Беларусь?

— Дрэва жыцця — адзін з распаўсюджаных вобразаў. Безумоўна, мне гэты сімвал блізкі, бо гэта сімвал існавання, развіцця, праз які шмат што можна перадаць. У свой час я стварыла калекцыю ўладароў Вялікага Княства Літоўскага — у гэтых работах вобраз дрэва быў узяты за аснову. У сярэдзіну ствала я змяшчала выявы Вітаўта, Альгерда ў медальёне, а праз галінкі і карані паказвала сваё бачанне той ці іншай гістарычнай асобы. Паводле гэтых выцінанак нават рабіліся вышыўкі. Сярод маіх улюбёных вобразаў — букеты кветак, вазоны. У дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве, у адрозненне ад жывапісу, дрэва заўжды мела сімвалічны сэнс. Адна з варыяцый дрэва жыцця — вазон, гэты вобраз атрымаў распаўсюджанне на маляваных дыванах, у ткацтве, вышыўцы. Выява вазона валодае станоўчай энергетыкай і сімвалізуе сям'ю, дабрабыт, лёс. Праз такія вобразы жанчына магла выказаць свае мары, жаданні, просьбы да Бога, Сусвету.

Люблю выразаць расліны, жывёл. Я не проста выразаю, напрыклад, воўка ці рысь, мне цікавы сэнс, які стаіць за выявай. Скажам, яблыня — жаночае дрэва, яе плады — новыя пакаленні, але для мяне яблыня — яшчэ і сімвал найстарэйшай жанчыны ў родзе, нашай прамаці. У матэрыяльным свеце для мяне гэта мая бабуля, якой споўнілася 93 гады. Я часта запісваю яе голас на дыктафон і кожны раз чую ад яе новае беларускае слова.

— Што вас натхняе на творчасць?

— Крыніц натхнення шмат. Стасункі з людзьмі, сустрэчы з фальклорам, удзел у рэканструкцыі народных свят абуджаюць вібрацыі, якія пераплаўляюцца ўва мне ў візуальныя выявы. Ёсць у мяне выцінанкі, у аснове якіх ляжаць традыцыйныя вобразы — з ткацтва, вышыўкі, народнага мастацтва. Іншыя работы больш звязаныя з маім унутраным светам, філасофскімі разважаннямі. Яны таксама базіруюцца на міфалогіі, сімволіцы, якая бярэ пачатак у беларускіх каранях, іх адметных мясцовых асаблівасцях. Я не толькі ў выцінанках гэта паказваю, але і пішу ў дапаўненне да іх невялічкія апавяданні, з якіх складаю кніжку. Некаторыя размяшчаю ў Фэйсбуку, і людзі адзначаюць, што гэтыя тэксты разам з выцінанкамі глыбока іх закранулі, абудзілі нейкія патаемныя струны ў душы. Яшчэ адна асаблівасць маіх выцінанак — я ўжываю расквечаную паперу. У традыцыі яе, канешне, не ўжывалі, бо яе проста не было, хоць выцінанкі часам расфарбоўвалі ці рабілі з каляровай паперы. Я карыстаюся паперай для падарункаў, адмыслова шукаю такую, якая падыдзе для маіх мэт, дадасць пэўнага эмацыйнага акцэнту.

— Вы неяк сказалі, што выцінанка для вас — духоўная практыка.

— І практыка стасункаў з Сусветам, асэнсавання свету вакол мяне і майго ўнутранага «я».

— Давялося пабачыць паштоўкі, торбачкі з вашымі выцінанкамі — звяртаюць увагу нечаканае спалучэнне колераў, незвычайны матэрыял. Вы як бы пераводзіце гэты традыцыйны від мастацтва на сучасную мову.

— Выцінанка ў тым яе выглядзе, у якім яна існавала на пачатку мінулага стагоддзя і ў яго сярэдзіне, у сённяшнім асяродку не мае перспектыў. Яна мусіць развівацца, каб існаваць далей. На маю думку, захоўваючы прынцыпы, характэрныя для нашай выцінанкі, даследуючы тое, што было, варта ўкладваць гэтае мастацтва ў новыя формы. Прыкладам, у 2000 годзе на фестывалі мастацтваў «Славянскі

«Мне цікава выкарыстоўваць выцінанку для выказвання на тэму, якая мяне хвалюе, — гістарычную, экалагічную. У выцінанцы я зрабіла «Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека». Так традыцыйнае мастацтва выразання з паперы набывае сучаснае гучанне.»

базар» я была з выцінанкай адна, даводзілася тлумачыць людзям, што гэта такое. Прайшло два дзясяткі год — і на «Славянскім базары» мы ўбачылі афармленне сцэны ў выглядзе выцінанкі. Летась на Еўрапейскіх гульнях у Мінску на білбордах выкарыстоўвалася выцінанка. Усё часцей з'яўляецца яна і на вопратцы ў выглядзе прынтаў, вышыўкі.

Прыклад укаранення выцінанкі ў сучасны побыт — мае экалагічныя торбы. Я шыла іх з натуральнай тканіны, што была ва ўжытку, выбірала яе ў сэканд-хэндах, пасля набівала выявы розных жывёл, напрыклад, рысі. Кожная такая торба існуе ў адзінкавым варыянце. Рабілася выцінанка, потым выкарыстоўвалася як трафарэт для набівання малюнка. Нашмат прыемней хадзіць па вуліцы з арыгінальнай торбай, чым з пластыкавымі пакетамі. Да таго ж, мы даём другое жыццё матэрыялам, якія выкарысталі свой рэсурс у выглядзе кашулі ці спадніцы. Тэма экалогіі мяне хвалюе даўно, я збіраю смецце асобна і амаль не карыстаюся пластыкавымі пакетамі.

Ёсць у мяне паштоўкі з выцінанкамі, якія рабіліся ў межах экалагічнага праекта «Зялёнай сеткі» разам з амбасадай Швецыі. Прыкладам, на адной з такіх паштовак выяўлены хата, дрэва, буслянка. Але калі паглядзець на ўвесь абрыс цалкам, атрымліваецца бутэлька-апырсквальнік. Ці іншая выцінанка: воўк бяжыць уздоўж ракі каля лесу, а ўся выява мае абрыс пластыкавай бутэлькі. Ідэя была — звярнуць увагу на тое, колькі пластыку нас атачае. Наш свет літаральна «закаваны» ў пластык, і праз яго прарастае натуральнае жыццё.

Як бачна, мне цікава выкарыстоўваць выцінанку для выказвання на тэму, якая мяне хвалюе, — гістарычную, экалагічную. У выцінанцы я зрабіла «Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека». Так традыцыйнае мастацтва выразання з паперы набывае сучаснае гуча

Святлана ДЗЯТКО:

«Цешуся поспехамі *нашых выхаванцаў*»

Амаль два дзясяткі гадоў Святлана ДЗЯТКО працуе галоўным урачом Барысаўскага спецыялізаванага Дома дзіцяці. Па выніках абласнога конкурсу «Жанчына года Міншчыны-2019», арганізаванага ГА «Беларускі саюз жанчын», Святлана Анатольеўна прызнана адной з пераможцаў у намінацыі «Паспяховы кіраўнік». «Алеся» распытала яе пра складанасці працы з дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама пра шчасце і пра тое, як спраўджваюцца мары.

— А з чаго ўсё пачыналася?

— Муж у мяне вайсковец, у часы СССР служыў у Азербайджане, Манголіі, скончыў Ваенную акадэмію ў Кіеве. Як любая жонка афіцэра, я ездзіла па гарнізонах разам з ім. Усюды працавала па спецыяльнасці — я педыятр, скончыла Смаленскі медыцынскі інстытут. У Беларусь, на радзіму мужа, прыехалі ў 1993 годзе, апынуліся ў Барысаве. Праца ў практычнай ахове здароўя мне вельмі падабалася, і я ўладкавалася ўчастковым педыятрам у паліклініку. А ў 2002 годзе мяне прызначылі на пасаду галоўнага ўрача Барысаўскага дома дзіцяці.

— Да гэтага вам не даводзілася мець справу з дзецьмі-сіротамі?

— Працуючы на ўчастку, вядома, сутыкалася з нядобранадзейнымі сем'ямі. Здаралася, прыходзіла ў дом, а там — п'яныя дарослыя, у шафе сярод брудных ануч — галодныя, з каростай і вошамі, дзеці. Выклікала міліцыю, хуткую дапамогу, інфармавала службы апекі. Таму для мяне не было навіной даведацца пра дзяцей, якія маюць патрэбу ў абароне дзяржавы.

Іншая справа, што матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы была слабой, патрабаваўся рамонт будынка, узведзенага яшчэ ў 1979 годзе. Патрэбныя былі новая мэбля, адзенне дзецям... З вырашэння гэтых праблем і давялося пачынаць.

— Зараз у дзіцячым доме — прыгожыя цацкі, новая мэбля ў групах, добра апранутыя дзеці. З цяжкасцю верыцца, што не заўсёды так было...

— Галоўнае — моцна захацець, і абавязкова знойдзецца той, хто дапаможа. Стаўшы кіраўніцай, я задумала сур'ёзны рамонт. Адначасова дала аб'яву па тэлебачанні бягучым радком: прымем у дар калыскі, манежы. І... ніхто не адгукнуўся. Прыехала толькі гаспадыня сэканд-хэнда, прывезла дзіравыя рэчы: «Вы ж жанчыны, зацыруеце». Я тады заплакала і падумала: «Мае дзеці пазашыванае насіць не будуць». У думках я бачыла дзіцячы дом такім, які ён сёння. І працягвала далей стукацца ў розныя дзверы.

Вядома, мы атрымліваем фінансаванне як установа. Але заўсёды ёсць тое, у чым мы маем патрэбу, каб дзецям было ўтульна, а супрацоўнікам — камфортна. У нас ёсць спіс неабходнага, кожны з нашых

Гутарыла Агата СЛАВІНА
Фота: mpravda.by,
асабісты архіў С. ДЗЯТКО

сяброў можа выбраць тое, што яму па сілах. І свет не без добрых людзей. Адно з прадпрыемстваў кожны месяц пералічвае па 1200 рублёў. Валанцёры некалькі раз на год прывозяць патрэбныя рэчы, мэблю, цацкі. Да свят — падарункі і сюрпрызы. Мары збываюцца, калі не чакаць склаўшы рукі, а працаваць.

— Як дзеці трапляюць у дзіцячы дом?

— Наш Дом дзіцяці быў адкрыты ў 1944 годзе пасля вызвалення Барысава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Жылі ў ім дзеці, якіх асірацела вайна. Сёння ў нас выхоўваюцца 63 дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. А калі я прыйшла сюды працаваць, было 120 дзяцей, у мінулым бывала і 200, і каля 300. Чаму так многа? Дастаткова пачытаць гісторыі дзяцей — у іх адлюстравана гісторыя краіны. Напрыклад, у саракавыя гады часта сустракаецца такі запіс: бацька загінуў на фронце, маці рэпрэсаваная або памерла. Пазней дзеці змяшчаліся сюды па заяве бацькоў у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам. Для адзінокіх маці ў савецкі перыяд гэта было выйсце: яны атрымлівалі магчымасць працаваць. Былі і падкідышы, і адказнікі, і дзеці, чые бацькі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў або знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі.

У 2006 годзе з'явіўся Дэкрэт № 18, камісія па справах непаўналетніх стала забіраць дзяцей у нядобранадзейных бацькоў і змяшчаць у дзіцячыя ўстановы. Такое дзіця прызнаецца маючым патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Найважнейшай задачай з'яўляецца пошук сям'і для яго. Добра, калі бацькі адумаюцца, перастануць піць, забяруць малога. Яго могуць перадаць блізкім сваякам, калі такія ёсць і яны адэкватныя. Альтэрнатыўныя формы ўладкавання — прыёмная сям'я або дзіцячы дом сямейнага тыпу. Але часам, на жаль, уладкаваць хлопчыка ці дзяўчынку ў сям'ю не атрымліваецца, або дзіця мае нейкія сур'ёзныя захворванні. Тады яно накіроўваецца ў інтэрнатную ўстанову на дзяржаўнае забеспячэнне.

— Многія дзеці трапляюць да вас з эмацыйнымі траўмамі. Тобок, гэта ўсё ж асаблівыя дзеці. Што галоўнае ў рабоце з імі?

— Чалавечнасць, дабрыня. Нават не прафесіяналізм, хоць ён,

Штогод у нашай краіне пад патранатам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі праводзіцца дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Кіраўнікі органаў дзяржкіравання, парламентарыі, актывісты грамадскіх арганізацый наведваюць дзіцячыя інтэрнаты і дамы сямейнага тыпу, апякунскія і прыёмныя сем'і, віншуюць з Новым годам і Калядамі, уручаюць падарункі, абмяркоўваюць дапамогу ў вырашэнні бягучых праблем.

Заслужаны дзеяч культуры Беларусі дырыжор Рыгор Сарока ўручае Святлане Дзятко дыплом на ўрачыстай цырымоніі конкурса «Жанчына года Міншчыны-2019».

«Як бы добра ні было нашым малышам, у глыбіні душы мы разумеем: у іх не самае шчаслівае дзяцінства. Таму крыху песцім іх.»

безумоўна, вельмі важны. У працы з нашымі выхаванцамі недапушчальная абыякавасць. Калі чалавек не любіць дзяцей, яны гэта адчуваюць і не давяраюць яму. Такія людзі ў нас не затрымліваюцца. Мы стараемся стварыць для дзяцей добразычлівую абстаноўку. Нашы выхаванцы адкрытыя, лёгка ідуць на кантакт, радуюцца падарункам.

— Вы і калектыў установы фактычна замяняеце ім сям'ю...

— Гэта так. Усіх дзяцей ведаю па імёнах, памятаю гісторыю кожнага. Раніца пачынаецца з таго, што прыходзіць дзяжурная медсястра і дакладвае, як прайшла ноч. Калі ёсць нейкая праблема, я сама агледжу дзіця, прааналізую зробленыя прызначэнні. Штодня наведваю групы.

Але як бы добра ні было нашым малышам, у глыбіні душы мы разумеем: у іх не самае шчаслівае дзяцінства. Таму крыху песцім іх. Дазваляем больш, чым хатнім дзецям. Стараемся, каб нашы дзяўчаткі і хлопчыкі былі прыгожа апранутыя і заўсёды задаволеныя. А яшчэ мы вельмі спадзяёмся знайсці кожнаму з іх добрую сям'ю.

— Гэты працэс рухаецца?

— І даволі актыўна. За мінулы год 99% дзяцей, што выбылі ад нас, уладкаваныя ў сем'і: 17 вярнуліся ў біялагічныя, 19 дзяцей усыноўлена, 3 перададзеныя на апеку. Толькі адну дзяўчынку перавялі ў дзіцячы дом, бо мы не паспелі знайсці ёй бацькоў з-за доўгага судовага працэсу па пазбаўленні бацькоўскіх правоў, але, паводле нашых звестак, яна зараз на апецы.

Дзіця шчаслівае ў сям'і, калі яго ці яе любяць. Вельмі хочацца, каб нашым дзецям пашанцавала.

— Працаваць у дзіцячым доме зможа не кожны, і задача кіраўніка — падабраць такіх людзей. Вам гэта ўдалося?

— Цалкам. У нас цяпер працуе 120 чалавек. У кожнай з васьмі груп — 4 медсястры, 4 няні, настаўнік-дэфектолаг, выхавацелька. Яны працуюць кругласуткава, змяняючы адно аднаго. У нас свой харчаблок, свая пральня, ёсць кіроўцы, дворнікі, рабочыя па рамонце. І, як у любой арганізацыі, бухгалтэрыя, юрыст, а яшчэ — працэдурная медсястра, масажысткі і іншыя супрацоўнікі. Ёсць свая малочная кухня. Шэсць чалавек адпрацавалі ў Доме дзіцяці больш за 30 гадоў, дваццаць — больш за 25. Асноўная колькасць работнікаў — па 10-15 гадоў. Тры медсястры маюць стаж 36 гадоў, гэта ў іх адзінае месца працы. Апошнім часам прыйшла і моладзь: музычны работнік, медсёстры. І ўсе аб'яднаныя жаданнем зрабіць жыццё дзяцей яркім, цікавым, поўным любові і клопату.

— Што вас у вашай працы радуе?

— Цешуся поспехамі нашых выхаванцаў. Напрыклад, хлопчык з ДЦП робіць першыя крокі. Або дзіця не размаўляла доўгі час — і вось прамовіла першыя словы. Вядома, мы радуемся, калі дзіця сыходзіць у новую добрую сям'ю. І калі біялагічныя бацькі мяняюць свае паводзіны і забіраюць малыша дадому. Нагода для радасці — відэа і фота, якія дасылаюць нам усынавіцелі, каб мы маглі ўбачыць, як растуць і развіваюцца нашы выхаванцы. Чым горш складваўся лёс у дзіцяці спачатку, тым прыемней бачыць яго ці яе жыццёвыя поспехі. Вельмі вялікая радасць для нас, калі прыязджаюць нашы «выпускнікі» — ужо дарослыя. Нядаўна наведаў Алег, мы яго перадалі ў трохгадовым узросце ў Мар'інагорскую SOS-вёску. Цяпер ён вучыцца ў будаўнічым каледжы ў Мінску. Прыязджаюць і тыя, каго ўсынавілі замежнікі. Такіх прыкладаў мноства.

— Вы шчаслівы чалавек?

— Калі займаешся любімай справай, гэта, безумоўна, шчасце. Іншага лёсу я сабе не жадала б. Ні разу не пашкадавала, што выбрала педыятрыю. Калі сёння давялося б зноў рабіць выбар, ён быў бы такім самым.

Марафон поддержки

ОО «Белорусский союз женщин» организовало масштабную акцию поддержки медиков.

Старт акции «Марафон поддержки» был дан во время заседания президиума БСЖ. Состоялась видеоконференция с участием всех областных организаций и городской организации Минска, а также руководства главных управлений по здравоохранению регионов. Также участие приняла заместитель министра здравоохранения Елена БОГДАН.

Председатель ОО «БСЖ» Марианна ЩЁТКИНА подчеркнула, что женщины не могут оставаться в стороне от решения проблем здоровья и благополучия семьи. Она отметила, что в дни пандемии COVID-19 стало поступать очень много звонков из первичных организаций с предложениями помочь в борьбе с короновирусом. Есть много желающих оказать поддержку, и это неудивительно.

– Значительная часть медиков — это женщины, и мы как женское объединение хотим и просто обязаны по мере возможности облегчить их нынешнее положение. Медицинские работники находятся на передовой борьбы с COVID-19. Многие работают круглосуточно, оторваны от семей, некоторые, чтобы обезопасить родных, ночуют на работе, и тут возникает ряд бытовых неудобств. Мы можем помочь! При круглосуточной работе нужны горячие обеды, те же средства гигиены. У некоторых медработников дома пожилые родители, некоторые одни воспитывают детей – возможно, их семьям надо помочь в это время. Именно для решения таких конкретных проблем и создаётся благотворительный счёт Белорусского союза женщин.

Для акции «Марафон поддержки» открыт отдельный благотворительный счёт ОО «БЕЛОРУССКИЙ СОЮЗ ЖЕНЩИН»

УНП 100094859

BY06AKBB31350000001100000000

ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»

BIK AKBBBY2X

Юридическим лицам и ИП, в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 1 июля 2005 г. № 300 «О предоставлении и использовании безвозмездной (спонсорской) помощи» необходимо заключать договор предоставления безвозмездной (спонсорской) помощи. Контактное лицо по вопросам заключения договора — главный бухгалтер ОО «БСЖ» Нестерович Светлана Фёдоровна, тел. 8 (044) 519 48 24 .

Физическим лицам можно воспользоваться ЕРИП/ благотворительность, общественные объединения/женские общественные объединения/ Белорусский союз женщин/ благотворительный взнос. Далее в строках ввести ФИО и сумму взноса.

Дарить добро важно!

В числе первых подключился к акции «Марафон поддержки» женский актив Минщины. Рассказывает председатель Минской областной организации ОО «БСЖ» Светлана СОРОКО: «Сейчас нам крайне важно поддерживать друг друга. Медики самоотверженно выполняют свой долг, а наша задача – проявить к ним внимание и заботу. Акцию БСЖ поддержали все районы области. Реализуется целый комплекс мероприятий: это и сбор финансовых средств, и волонтёрская деятельность, и пошив средств индивидуальной защиты, и приобретение дезсредств, бытовых предметов. По мере необходимости доставляем всё по заявкам местных медучреждений. А это также и холодильники, стиральные машины, микроволновые печи, электрочайники, утюги, напольные сушилки и др. Хотела бы поблагодарить здесь всех неравнодушных людей!»

Знайдзіся, дзіця!

«Любіць нескладана, калі ўсё добра»

Вікторыя КУЗЬМІНА,
маці-выхавальніца дзіцячай вёскі «Вытокі»:

— Я выхоўваю семярых хлопчыкаў: трох маіх біялагічных сыноў, 13-гадовага Радзівона, Рамана 9 гадоў і Аляксандра 8 гадоў. І чатырох прыёмных. Хлопцы, якія засталіся без апекі бацькоў, рознага ўзросту: старэйшаму, Уладзіміру, 17 гадоў, Якаву — 16, таксама з намі сямігадовы Аляксандр і шасцігадовы Максім. Маці-выхавальніцай я працую 10 гадоў, і столькі ж часу са мной Валодзя і Яша. Тры дзіцяці ўжо выраслі і не жывуць з намі — гэта мае «выпускнікі».

Вядома, з хлапчукамі бывае складана. Але дзякуючы маім выдатным сябрам, дасведчаным псіхолагам дзіцячай вёскі «Вытокі» я спраўляюся. Ды і старэйшыя хлопцы, Уладзімір і Якаў, актыўна дапамагаюць у выхаванні малодшых, іх прыклад, словы і справы маюць вялікую вагу і значэнне. Дапусцім, заняткі спортам: старэйшыя хлопчыкі любяць футбол, адціскванні, і тыя, каму ад шасці да дзевяці, таксама стараюцца не адставаць. Валодзя з Яшам настаўляюць і ў бытавых пытаннях: «Ложак трэба засцілаць вось так. Мама не нянька, ты павінен умець паклапаціцца пра сябе сам». А якія пірагі мы пячэм разам — пальчыкі абліжаш! Мае хлапчукі ўсё ўмеюць самі: і прыбраць у доме могуць, і гатуюць смачныя стравы. Гэта і ёсць агульны побыт сям'і, дзе кожны па сваіх сілах робіць нешта для дабра ўсіх. Разам працуем на агародзе, разам фарбуем дрэвы, робім прыборку і гатуем абед. Сямейныя каштоўнасці фарміруюцца праз супрацоўніцтва. Я заахвочваю ў дзецях ініцыятыву.

Магу з асабістага досведу сцвярджаць: пры ўсіх тых добрых умовах, якія ствараюцца ў нас у дзіцячых дамах, толькі сям'я паўнавартасна рыхтуе да дарослага жыцця, адаптуе да грамадства. Найлепшы прытулак ці інтэрнат гэтага не здолеюць. Калі ты кругласуткава знаходзішся побач з дзіцём, працэс навучання і выхавання не спыняецца ніколі. Клопат, ласка, добрае слова і эмацыйная падтрымка патрэбны хлопчыкам і дзяўчаткам увесь час, а не толькі некалькі гадзін у дзень. Як узаемадзейнічаць з людзьмі, арганізаваць свой побыт, набыць іншыя неабходныя навыкі? На ўсе гэтыя пытанні адкажа толькі сям'я. Мы нават у садок аддаём дзяцей на паўдня: навучаем у садку, выхоўваем дома. Псіхолагі пацвердзяць: нават калі ты не займаешся з дзіцём, яно назірае за табой і несвядома капіруе твае паводзіны. Так закладваецца характар, сцэнар будучага жыцця — і важна, каб гэтыя працэсы не далі збою! Нават пірог сумесна спячы — гэта вельмі шмат значыць. А ў дзіцячым доме дзеці атрымліваюць усё гатовае: згатаваную ежу, памытае і папрасаванае адзенне. Яны не бачаць, як купляюцца прадукты, варыцца суп ці пячэцца пірог.

Але гэта не азначае, што ў сям'і вас не чакае ніякіх цяжкасцей. Калі вы прымаеце адказнае рашэнне ўзяць дзіця з дзіцячага дома, то падрыхтуйцеся да гэтага кроку — не толькі маральна і псіхалагічна, але і фізічна, бо дзеці патрабуюць шмат сіл. Заручыцеся падтрымкай з боку лекараў і псіхолагаў, а таксама родных і блізкіх людзей. Прайдзіце спецыяльную падрыхтоўку. І памятайце, што дзіця — гэта асоба са сваім характарам і сваім мінулым, часта не бясхмарным. Часам спачатку ўсё ідзе гладка, а потым хлопчык ці дзяўчынка пачынаюць расці, узнікаюць праблемныя пытанні. Трэба быць мудрымі і цярплівымі, мець

сяброў і спецыялістаў, якія дапамогуць вам парадай і справай.

Перад тым, як узяць дзіця ў сям'ю, пазнаёмцеся з ім. Гучыць банальна, але на самой справе гэта важна. З выгляду ўсе дзеці прыгожыя і кранальныя, але бывае так, што менавіта з гэтым дзіцём вам цяжка будзе сысціся характарамі. Спачатку трэба пасябраваць з маленькім чалавекам, і толькі потым пачынайце яго ці яе выхоўваць, навучаць. Таму што, калі паміж вамі не будзе сяброўства, цёплых і шчырых адносін, паўплываць на паводзіны дзіцяці вы не зможаце. Ласка, сардэчнасць — на першым месцы. Будзьце гатовыя да таго, што дзіця будзе пастаянна правяраць, ці прымаеце вы яго такім, якое яно ёсць. Ці любіце яго, калі яно плача, нервуецца, робіць нешта не тое: ламае цацкі, кажа вам крыўдныя словы. Калі ўсё добра, любіць дзіця нескладана. А калі з'яўляецца праблема, трэба паказаць свайму выхаванцу, што вы яго прымаеце безумоўна.

Усё роўна, у якім узросце адбылася ў дзіцяці драма, — усе дзеці, якія спазналі няшчасце са сваімі біялагічнымі бацькамі, траўмаваныя. Гэта трэба ўлічваць. Бываюць неўсвядомленыя ўчынкі і паводзінныя рэакцыі, дзіця само не разумее, чаму плача або капрызіць. Дарослы павінен мець цвёрдую вытрымку, мудрасць і, вядома, падтрымку з боку педагогаў і псіхолагаў, а таксама ўнутраны стрыжань і пазітыўную ўстаноўку: «Усё атрымаецца, я дапамагу дзіцёнку і ён (яна) будзе шчаслівы».

Не саромейцеся прасіць парады ў спецыялістаў. Ваша задача — накіраваць характар, здольнасці дзіцяці ў добрае рэчышча, дапамагчы яму ўсвядоміць сямейныя каштоўнасці, сфарміраваць маральныя прынцыпы. Вядома, гэта складаны, доўгі працэс, справа нават не пяці, а часам сямідзесяці гадоў. Я гэта бачу па сваіх выхаванцах, у якіх стараюся ўкладаць шмат добрага і разумнага, і вынікі з'яўляюцца не адразу. Лягчэй, калі дзіця з маленства жыло ў нядрэнных умовах. А калі спазнала цяжкі досвед, калі ўжо сфарміраваны негатыўныя звычкі, уздзейнічаць на іх бывае цяжка. Што ў такіх выпадках раблю? Стараюся наладзіць адносіны, падказаць, калі просіць парады — дапамагчы. Навязваць сваю волю сілай не мае сэнсу, бо асоба фарміруецца ў раннім дзяцінстве. Змяніць асобу немагчыма, але можна ўплываць на дзіця праз супрацоўніцтва, сяброўства і прыняцце.

Максім

Вясёлы, абаяльны, усмешлівы, гаваркі, любіць увагу і актыўныя гульні. Дапытлівасць гэтага шасцігадовага хлопчыка не ведае межаў: Максім хоча ўсё ведаць, усім цікавіцца і задае шмат пытанняў. Ласкавы і прыязны, ён ахвотна ідзе на кантакт, гатовы пагаварыць на любую тэму. З задавальненнем гуляе з іншымі дзецьмі, шчыры і адкрыты з дарослымі. Жыццярадасны і рухавы, не любіць доўга сядзець на адным месцы. Займаецца спортам, ахвотна катаецца на самакаце, ровары, гуляе ў футбол, зімой — у снежкі. Сабраць што-небудзь з дэталей канструктара, пакорпацца ў пясочніцы разам з іншымі дзецьмі — таксама ўваходзіць у кола яго захапленняў.

Цяпер Максім жыве ў дзіцячай вёсцы «Вытокі» разам з іншымі рабятамі. Калі знойдзецца сям'я, гатовая ўзяць яго пад апеку, каб займацца яго усебаковым развіццём, хлопчыку гэта пойдзе толькі на карысць.

ДУА «Дзіцячая вёска «Вытокі»

Тэл. 8 (017) 505-56-59

Аляксандр

Сямігадовы Саша — спакойны, прыязны, разумны і старанны. Камунікабельны і вясёлы. Любіць актыўныя і пазнавальныя гульні. Ахвотна і з канструктарам павозіцца, і за мячом пабегае, і ў альбоме намалюе карцінку. Саша добры хлопчык, гатовы клапаціцца пра іншых і дзяліцца з імі прысмакамі і цацкамі. Любіць жывёл. У верасні ён пойдзе ў першы клас, а пакуль вучыцца лічыць і чытаць. Кемлівы і цікаўны, схоплівае веды на ляту, мае добрую памяць. Уразлівы і эмацыйны, Саша доўга памятае добрыя моманты жыцця: паездкі, сямейныя святы. А яшчэ ахвотна і без напамінкаў дапаможа маме — падмяце, прыбярэ рэчы на месцы. І вельмі любіць слухаць казкі!

У дзіцячай вёсцы «Вытокі» забяспечваецца паўнавартаснае яго выхаванне. Але здольны хлопчык зможа дасягнуць большых поспехаў, калі знойдзецца сям'я, гатовая аддаваць яму шмат часу і падтрымліваць на жыццёвым шляху.

ДУА «Дзіцячая вёска «Вытокі»

Тэл. 8 (017) 505-56-59

Ольга КОСТЕЛЬ:

«Когда не хватает слов, начинается танец...»

Она обладает манящей природной красотой, за которой скрывается характер удивительной силы. С детства именно танец делал её счастливой. Сейчас она дарит эту радость зрителям. Сегодня мы беседуем с балетмейстером-постановщиком Большого театра Беларуси Ольгой КОСТЕЛЬ.

— Танец в вашей жизни присутствует с детства? Или родители видели вас идущей по другой профессиональной стезе?

— Могу сказать, что танец с детства вызывал во мне радость. Ещё большее счастье у меня вызывало понимание, что твой танец может приносить радость другим. Но вот когда я, немного повзрослев, заявила родителям, что хочу стать балериной, в восторге они не были. Оба хотели, чтобы я получила профессию, которая позволит твёрдо стоять на ногах. Потом были длинные разговоры с преподавателями и знакомыми. В итоге родители сдались, но при условии: если поймём, что не получается — сразу забираем документы.

— Вы окончили Минский хореографический колледж, работали в труппе балета Большого театра. А когда вы поняли, что хотите создавать спектакли, а не танцевать в них?

— Профессия артиста балета очень жестока. «Балет — это каторга в цветах», — говорила Раневская. Жестока она не только потому, что необходимо изнурять себя многочасовыми тренировками, отрабатывая филигранность каждого па, но и потому что ты являешься заложником своих физических данных от рождения. Сколько бы ты ни работал в зале, ноги длиннее не станут, а прыжок не будет выше, увы.

Елена БАЛАБАНОВИЧ
Фото: Аника НЕДЕЛЬКО, Павел СУЩЁНОК



– Можете ли вы назвать хореографов, работы которых вас потрясли однажды или восхищают теперь?

– Меня восхищают очень разные хореографы, каждый из них имеет свой неповторимый почерк. Это и Морис Бежар, и Уве Шольц, и Юрий Григорович, и Вим Вандекейбус, а фавориткой является Пина Бауш. Когда я смотрю её спектакли – забываю, какой сегодня день недели...

«Танец – это тоже язык, а искусство хореографа – это умение рифмовать, сочетать движения.»

Рада, что, будучи молодой, мне хватило мужества и профессионализма признаться себе в том, что для примы я не обладаю нужными данными, а довольствоваться меньшим не хотела.

Что касается постановок, то у меня был интерес к этому с самого начала. Не знаю почему, но я очень часто переделывала комбинации преподавателя по классике. Это не могло не раздражать моего первого педагога, поэтому я никогда не была в любимчиках.

А настоящим импульсом поменять профессию стало предложение немецкого хореографа, профессора Берлинской академии драматических искусств Дитмара Зайффферта. Он приехал в наш театр ставить «Тщетную предосторожность», обратил на меня внимание — и предложил поступить к нему на курс.

— Помните свою первую работу как постановщика? Как оценили бы её сейчас?

— Моей первой работой была миниатюра «Белый дом», где я экспериментировала с разными стилевыми направлениями в танце, смешала брейк-данс, сальсу и балет. Это была история одиноких молодых людей, праздно проводивших своё время, заблудившихся в интернет-пространстве, за которых все решения принимал искусственный интеллект. За эту работу я получила награду «Дебют» на международном фестивале в Витебске. Миниатюра с успехом шла в репертуаре учебного театра академии в Берлине.

«Белый дом» был поставлен в 2005-м, сейчас — 2020-й. Но и тогда, и теперь мне сложно быть довольной собой: я постоянно сомневаюсь. Бывают моменты, когда мне доставляет радость реакция зрителей, если они уходят домой растроганными. Но это кратковременное состояние радости. Я бы сказала, что это драгоценные блёстки моей профессии. Наступает следующий день — и опять начинаются блуждание, поиски, сомнения, недовольство собой. Всегда хочется больше, тоньше, пронзительнее, самобытнее...

Ирина Еромкина (Анна), Игорь Оношко (Вронский), Никита Провалинский (Серёжа Каренин).

Сцены из балета «Анна Каренина».

«Наступает следующий день — и опять начинаются блуждание, поиски, сомнения, недовольство собой. Всегда хочется больше, тоньше, пронзительнее, самобытнее…»

— Каких принципов придерживаетесь, выстраивая работу с артистами?

— Наблюдая за людьми вокруг и за собой — как за постановщиком, так и за зрителем — поняла, что публика, идя в театр, хочет ощутить эмоциональный взрыв. Но одновременно не желает этого. Постараюсь объяснить. Если зрителю заранее известно, что спектакль или фильм очень тяжёлый, требующий сильных эмоциональных переживаний, то, скорее всего, он не купит билет. Если же зритель знает, что спектакль или фильм прекрасны, то он обязательно купит билет, хотя, возможно, там будут те же сильные эмоциональные переживания, но после них, как правило, придут состояние счастья и очищения. Человек так устроен: он избегает сильных эмоциональных переживаний, но одновременно только они дают ему ощущение полноты жизни.

У артистов то же самое. На первых репетициях большинство избегает искренних, открытых реакций. Но постепенно, если ты даёшь им уверенность и понимание, что самое драгоценное — это их личное, образ героя приобретает живые, неповторимые черты. Трогает то, что является правдой, и наоборот, как бы изящно ни была придумана роль, она оставляет равнодушными зрителей, если в ней нет правды, если зритель не узнает в ней себя.

— Где черпаете вдохновение?

— Я вдохновляюсь поэзией и хорошей литературой. Очень люблю стихи Бориса Пастернака и Райнера Марии Рильке, не перестаю восхищаться гением Владимира Набокова. Ведь танец — это язык, а искусство хореографа — это умение рифмовать, сочетать движения. Я люблю путешествовать, наблюдение за природой даёт мне много идей. Вдохновение или озарение — это, с одной стороны, плод кропотливой и долгой работы, оно никогда не бывает на пустом месте, но с другой, чтобы его поймать, надо отвлечься, восхититься чем-то…

— Что для вас талант и гениальность? Это вещи одного порядка или разного?

— Сложно судить, но точно знаю, что хорошей проверкой служит время. От произведений Эсхила и Еврипида нас отделяют более 2-х тысяч лет,

но, когда читаешь их пьесы, складывается ощущения, что эти произведения — о нас сегодняшних. Слушая произведения Моцарта, Чайковского или Баха, сложно остаться равнодушным. Вот, наверное, это и есть талант, гениальность.

— Ваши постановки шли на сценах Великобритании, Германии, Болгарии, Польши, Финляндии, Швейцарии, России. Может быть, выделите для вас особенную работу?

— Самой запоминающейся стала моя первая самостоятельная работа — балет «Коппелия-2» в Софии в 2008 году. Помню, я так переживала на премьере, что ушла в парк и весь спектакль просидела на скамейке — ждала, пока за мной придут... Очень хорошо почувствовала тогда, какая это ответственность: забирать время у зрителя, думать, что тебе есть что сказать, более того — что это будет интересно публике. Спектакль шёл с успехом несколько сезонов. Но это волнение и ожидание на скамеечке в парке, это ощущение бессилья и одиночества я никогда не забуду.

— В этом сезоне ваш балет «Анна Каренина» стал украшением программы белорусского Большого. Почему решили обратиться именно к Толстому?

— Мечта создать балет «Анна Каренина» родилась в 2014 году, но интенсивно работать над материалом я начала в конце 2016-го, тогда же подала творческую заявку руководству театра. Изначально остановилась на трёх русских композиторах: Чайковском, Рахманинове и Скрябине. Но чем больше погружалась в материал, тем яснее понимала: для моей работы достаточно только Чайковского.

Сложно описать, какая она — моя Анна. Мне кажется, если хватает слов, чтоб описать героиню, то нечего тогда танцевать, ведь танец начинается там, где не хватает слов... Мне кажется, литература, как и любое другое искусство, — это не слова. Это то, что между слов. Каждая из трёх артисток (Ирина Еромкина, Людмила Уланцева, Александра Чижик) по-своему меня поняли и по-своему воплотили поставленную актерскую задачу. И каждая по-своему была хороша. Но, например, в сценах с ребёнком у меня фаворитка — Ирина Еромкина.

Балет «Любовь и Смерть». Байджан – Ирина Еромкина, Азер – Юрий Ковалёв.

Константин Кузнецов (Каренин), Людмила Уланцева (Анна). Балет «Анна Каренина».

— Скажите, ваша природная красота вам часто помогает?

— Честно говоря, нет. Из-за моей внешности меня всегда воспринимали несерьёзно. Это если говорить о работе хореографа и постановщика. Раньше я очень огорчалась по этому поводу, сейчас это случается довольно редко.

— Как относитесь к критике?

— Критика бывает разной. Хотя даже конструктивная критика меня ранит... Но это не означает, что я не прислушиваюсь. Просто когда ты создаешь полотно, то находишься в состоянии «без кожи». И любая критика лишает меня равновесия. На какое-то время. Но это и есть, наверное, своеобразное столкновение с жизнью: одни её проявления нарушают твою гармонию, другие позволяют тебе её обрести. В общем-то, это и есть танец... Это игра со своим равновесием...

— Недавно вы обронили, что в ваших планах есть идея поставить роман Достоевского. Можете уже приоткрыть завесу тайны?

— Очень надеюсь, что следующей постановкой на родной сцене будет балет «Идиот» по мотивам одноименного романа Федора Достоевского на музыку Густава Малера. Несколько недель назад я озвучила это творческое предложение художественному руководителю театра — Валентин Николаевич Елизарьев одобрил.

— Если говорить о танце, что для вас важно: сохранять традиции или выстраивать что-то новое? Предрекают, не за горами балет с участием андроидов. Готовы к таким экспериментам?

— Для меня важна правда. Когда образ создан так, что зритель видит в нём себя, начинается тот волшебный момент сопереживания. А каким языком это решено — мне не так важно. Может быть удивительно трогательной постановка, рассказанная классической лексикой, а может быть поставлен спектакль, где используются самые необычные движения, но почему-то после нескольких минут хочется домой...

Вы знаете, не думаю, что андроиды будут интересны зрителям. Человека интересует он сам. Сколько тысяч лет уже прошло — а он всё не устает искать ответы на поставленные им же вопросы. Кто я? Куда иду? Зачем? Что есть смысл жизни? Что такое смерть? Что такое любовь?

«Человека интересует он сам. Сколько тысяч лет уже прошло, а он всё не устает искать ответы на поставленные им же вопросы. Кто я? Куда иду? Зачем? Что есть смысл жизни? Что такое смерть? Что такое любовь?..»

Блиц

Принцип, которому стараетесь не изменять в жизни и в творчестве?
– Любознательность.

Напиток?
– Хорошее вино.

Аромат?
– Запах розмарина и сандалового дерева

Книга, которую читаете сейчас?
– Их две: «Толстой и Достоевский. Противостояние» Джоржа Стайнера и «Л. Толстой и Достоевский» Дмитрия Мережковского.

Песня, которую напеваете дочери на ночь?
– Ева Софи лучше всего засыпает под белорусскую «Калыханку».

Музыка?
– Сейчас часто слушаю Густава Малера, Яна Сибелиуса. Выбор зависит от внутренней потребности. Если настроение плохое, ставлю Коула Портера или французских шансонье.

Животное?
– Лошади.

Недостаток, от которого хотели бы избавиться?
– Неуверенность в себе.

Качество, которым гордитесь?
– Любознательность, жажда узнать, что скрывается там, где, как уверены другие, ничего нет.

Чего никогда не простили бы человеку?
– Это зависит от того, кто этот человек. Любимому человеку простила бы всё.

Хореограф – мужская профессия?
– Думаю, профессии не имеют гендерных различий. Женщине сложнее самоутвердиться в любой профессии, прежде всего потому, что на её плечи возлагается вся тяжесть рождения и воспитания детей.

«Для меня важна правда. Когда образ создан так, что зритель видит в нём себя, начинается волшебный момент сопереживания. А каким языком это решено – мне не так важно…»

— Вы не только работаете на несколько стран, но и живёте. Расскажите немного о своей семье.

— Сейчас я живу в своеобразном шпагате — между Люксембургом и Минском. С моим мужем мы познакомились в Берлине. Оба были студентами, но учились в разных вузах. Я хореограф, он — дипломат. Мой супруг старается не пропускать моих премьер, а если не удаётся быть на первых показах, смотрит спектакль в записи. Ну и, конечно, он — первый человек, которому я рассказываю свои идеи и замыслы и от которого я получаю критику, иногда и очень хлёсткую.

— Где всё-таки ваш дом?

— Хотелось бы ответить словами Милана Кундеры. «У деревьев дом там, где они получают достаточно тепла, солнечных лучей и влаги, а у людей дом там, где их любят...»

«Анна Каренина». Поклоны после премьеры балета на сцене Большого.



То, что вы воспринимаете спокойно, больше не управляет вами.

Конфуций

Быть собой

Раздел ведёт

Татьяна ЛЕВИНА, детский, подростковый и семейный психолог, гештальт-терапевт. Можно направлять вопросы на адрес **korre@tut.by**, отвечу всем.

— Есть ли различие между чувствами и эмоциями?

— Да. Эмоции — более широкое понятие, нежели чувства. Ещё одно важное различие: эмоции, как правило, ориентировочны, сообщают нам о недостатке или избытке чего-либо. Чувства же предметны и конкретны. Эмоции в большей степени связаны с нашим бессознательным. Чувства максимально представлены в сознании и имеют определённое внешнее проявление.

Попытки психологов выделить, назвать основные эмоции привели к тому, что появилось множество мнений и теорий. Чаще всего обозначаю такие: радость, удивление, страдание, гнев, отвращение, презрение, страх, стыд, обиду, зависть, ревность, восхищение, нежность, любовь и др. Но нюансов и оттенков гораздо больше.

Говорят ещё и про эмоциональный интеллект. По определению Стивена Дж. Стейна и Говарда Бука, в отличие от привычного всем понятия интеллекта, эмоциональный «является способностью правильно истолковывать обстановку и оказывать на неё влияние, интуитивно улавливать то, чего хотят и в чём нуждаются другие люди, знать их сильные и слабые стороны, не поддаваться стрессу и быть обаятельным». Согласитесь, стоит развивать — в жизни пригодится.

В прошлом номере журнала «Алеся» я рассказывала вам про радость, злость, страх, стыд. А сейчас поговорим про отвращение, грусть, любовь и вину.

Фууу… Мне это не нравится

Отвращение — физиологичное, хорошее и полезное чувство, но совершенно неприятное. Оно сообщает, что вы столкнулись с чем-то неподходящим (обычно эта эмоция даже на лице написана). Оно защищает нас от отравления чем-то несъедобным, опасным для здоровья, как физического, так и психического. Противными могут быть и слова, и ситуации, и люди.

Если не распознавать своё отвращение, то могут возникать такие ситуации:

- ✓ зависимые и созависимые отношения;
- ✓ сложности в понимании своих желаний, что чревато снижением ощущения счастья в жизни и отсутствием целей, результатов, достижений;
- ✓ расстройства пищевого поведения (анорексия и булимия);
- ✓ трудоголизм со всеми вытекающими последствиями, вплоть до серьёзных заболеваний;
- ✓ высокий уровень тревожности.

Важно вовремя понять: «Всё, стоп! Мне это не нравится, я этого больше не хочу и не буду!»

«Не грусти»

Фраза, которую часто говорят тем, кто печалится. Но она совсем не успокаивает, скорее, даже злит. А как можно не грустить, не печалиться, если ты что-то важное в жизни потерял? Любимую банковскую карточку или такую красивую и радужную иллюзию про отношения. А если близкого человека — то совсем горе.

Грусть заставляет нас замедлиться в суете дней, остановиться, обнаружить себя, свой дефицит: нет уже кого-то или чего-то очень важного или любимого. В этот момент важно побыть с собой или найти друга, чтобы послушал или просто побыл рядом. И тогда грусть отпускает. И потеря может стать новой мечтой… А то, что не вернётся к нам никогда, стоит отгоревать, разжать сердце и отпустить. Утешить себя и жить дальше.

О тревоге замолвим слово

Тревога — сегодня очень популярное переживание. Ощущается как беспокойство, волнение, может сопровождаться телесными проявлениями, разными по интенсивности. Часто возникает, когда много неопределённости. В отличие от причин страха, который конкретен, причины тревоги не осознаются, а порой реально их и нет… Но точно есть подсознательная мобилизация всех сил организма для борьбы с потенциально опасной ситуацией.

По мнению некоторых исследователей, тревога представляет собой смесь нескольких эмоций: страха (представляется всё самое плохое с опорой на предыдущий жизненный опыт), печали (вдруг с чем-то или кем-то придется расстаться), вины («я ничего не могу сделать» или «мои поступки приведут к ещё худшему») и стыда («не справляюсь, значит со мной что-то не так»). Согласитесь, неприятнее переживания и не придумаешь.

Что же запускает тревогу? Перенос неприятностей из прошлого в будущее. При этом в настоящем «здесь и сейчас» может и не быть реальной опасности. Кстати, человек может испытывать тревогу и по поводу событий, которые с ним никогда не случались, но он был их свидетелем.

Есть ещё тревожность, но это уже черта личности. Люди значительно различаются между собой по уровню своей тревожности, в интернете есть тесты-опросники для определения личностной тревожности и для оценки ситуативной (реактивной) тревожности. По желанию эти тесты можно пройти.

О любви немало песен сложено

Говорят, без неё не живут. И любовь всегда с нами, в нашем сердце. Кому-то, чтобы её почувствовать, нужен другой человек, а кто-то умеет наслаждаться любовью к себе. Скорее, и не чувство это вовсе, а изменённое состояние сознания, которое сопровождается гормональным всплеском, приятными телесными переживаниями, что приводит к выработке огромного количества энергии, способной творить подвиги и чудеса.

Искусству любви можно учиться, и даже навык такой натренировать (на детях, например). Но чаще, когда мы ждём любовь, томимся и желаем услышать три заветных слова, актуализируются наши общечеловеческие потребности в привязанности и близости. Когда хочется, чтобы был кто-то, с кем можно поделиться сокровенным – и тебя бы выслушали, поняли, порадовались с тобой, не осудили, поддержали и утешили, если необходимо.

Упражнение про любовь: *вспомните себя в детстве, дом, где вы жили, состояния, ощущения, вещи, запахи. Напишите 10 слов-ассоциаций к слову «дом». Пока дальше не читайте :)*

А теперь замените слово «дом» на слово «любовь». Есть совпадения?

«Если виноватых нет, их назначают. Совесть обычно мучает не тех, кто виноват».

Э. М. Ремарк

Не виноватая я!

В норме чувство вины присуще каждому человеку. Вина, в принципе, задумывалась как хорошее чувство. Например, конструктивная вина про соблюдение нравственных законов. Сделал кому-то плохо — попроси прощения, предложи исправить ситуацию или предложи компенсацию, больше так не делай и забудь. Она про эмпатию, человечность и уважение к другим. И хорошо бы также к себе быть бережными, не винить, не мучать себя всю жизнь за совершённые ошибки.

Есть, правда, и деструктивная вина. Когда не понимаешь толком, в чём ты виноват, но и освободиться от этого чувства не можешь. Такая вина заставляет нас подстраиваться под других людей или события, выбирая роль жертвы. И способна до депрессии довести…

ЗАДАНИЕ: **Спросите себя, каким вы выбираете быть:**

1. Справедливым или оптимальным?
2. Хорошим или здоровым?
3. Правильным или счастливым?

**** ОТВЕТ: выбирая правую сторону, вы выбираете быть собой, а значит, действительно нужным, ценным и счастливым человеком.*

Ксения Фёдорова: «Важный компонент счастья — *свобода выбирать себе жизнь»*

Тамара ВЯТСКАЯ
Фото из личного альбома К. ФЁДОРОВОЙ

Мы встретились с Ксенией Фёдоровой в разгар пандемии в её пустующем баре «Синяя коза» и говорили долго-долго. Но всё равно я не успела расспросить её о многом: например, о любимых стихах, любимых местах отдыха, любимых блюдах... Потому что говорили мы в основном о её деле, о её становлении в бизнесе и её разочарованиях, о поиске и принятии решений.

И, думаю, я поняла о ней главное: она из тех людей, кто никогда не отчаивается и не останавливается. Ксения Фёдорова — очень взрослый человек. Несмотря на внешнюю хрупкость, она всегда отвечает за свои действия и свой выбор — а испытаний жизнь приготовила ей бесконечную череду.

Из аккаунта Ксении в соцсетях:

«Когда всё это, этот вирус, закончится, я первым делом ворвусь в бар и попрошу огро-о-о-мную чашку капучино с огро-о-о-мной шапкой упругой пены. Щедро посыплю её корицей и мускатным орехом. Выйду с чашкой на улицу, буду вдыхать свежий воздух и думать о седом и мудром мироздании. А после того, как выпью кофе жадными глотками, я продолжу жить. Потому что всё происходящее дало мне понять: жить надо здесь и сейчас. Никакого "потом" может не быть. Очень, очень остро я это чувствую — это сейчас».

А начался наш разговор с воспоминаний о детстве и детских мечтах. Оказалось, что свой первый суп Ксения сварила в 10 лет, а к 16-ти она была уже с вполне сложившимся характером и занималась тем, чем хотела.

— Я была такой ребёнок-бунтарь, своенравная, дерзкая, давала прикурить родителям. В юности хотелось диссидентствовать, слушала допоздна с друзьями «Наутилус Помпилиус». Первые поцелуи, осознание самостоятельности, лето на Цнянке... Удивительно, но тогда не мечтала ни о семье, ни о детях, видела себя и будущее только в саморазвитии. А в сочинении вообще написала, что буду следователем ОБХСС, приплела комиссара Катани — учительница читала вслух в классе, и все вместе хохотали...

Неожиданно для друзей Ксения поступает вдруг в Минский техникум советской торговли. Это была радость для родителей и выброшенные годы для неё, как она тогда считала. Для нынешнего времени это потрясающая профессия, которая Ксении очень пригодилась. Но тогда она училась без особой радости, параллельно пытаясь зарабатывать на бирже, куда прошла через огромный конкурс. И именно там она поняла, что ей не хватает серьёзных знаний. Перешла в турбизнес, возила группы поляков в Анапу, зарабатывая на разнице валют, на продаже опта. Собрала очень неплохие по тем временам деньги и поступила в только что открывшийся ЕГУ. А потом — шаг конём: Ксения, желая получить серьёзное образование, едет учиться в Сорбонну!

Это было и смело, и рискованно, и авантюрно, безусловно. Её французский был непонятным для парижан, а двести долларов в кармане на жизнь закончились за две недели... Но работы она не боялась, и работа находилась; с подружкой снимали квартиру на двоих — так дешевле. За годы учёбы во Франции Ксения много увидела и узнала. И два города — Париж и Питер — для неё теперь любимые навсегда. Будучи студенткой Сорбонны, она вышла замуж, в этом браке пребывает и поныне — в середине лета у её семьи серебряная свадьба.

Есть люди, «заточенные» с детства только на семью, и есть другие. Она была из других, но с неоправданно заниженной самооценкой: она всегда могла больше, чем сама думала, она даже себя считала ленивой...

Из аккаунта Ксении: «В юности решила делать всё, чтобы стать независимой от мужчин. Я осознала необходимость иметь свой крепкий тыл и всегда помнить о собственных правах. И тогда уже я думала, что важный компонент счастья — свобода выбирать такую жизнь, какую мы хотим. Никогда у меня и мысли не было бросить работу ради семьи, а свои годы отдать только мужу и детям... Мне повезло — скандалить или устраивать сцены и ссоры мне для этого не приходилось. Меня понимали и поддерживали, в большей своей части, безусловно».

Вам странно в это поверить? У Ксении сегодня три направления в бизнесе: бар «Синяя коза», маникюрные салоны «Сороки» и «Ноготки» и арт-пространство «Место», которое появилось совсем недавно, осенью прошлого года. Но у Ксении есть и ещё не менее интересные идеи.

— Многие мне говорят, что я очень хозяйственная: берегу каждый рубль и стараюсь его грамотно вложить. Всё, что открывала, — за собственные деньги, муж не участвовал в моих бизнесах. У меня же ещё есть и диплом нашего БГЭУ, и я всегда сама просчитываю основные ошибки и риски. Бар «Синяя коза» я увидела во сне, с этим интерьером, как сейчас есть. Я увидела этот образ, а утром поняла, что мне приснилась картина Марка Шагала «Козы на ветру». Потом вспомнила, что и у Пабло Пикассо тоже есть картина с козой. Так два моих любимых художника помогли мне. И, конечно, в моей концепции «Синей козы» есть некоторые ассоциации с барами на Монмартре начала прошлого столетия.

А маникюрня — это была идея, привезённая из Парижа: там сидят такие парижанки с бокалом вина или чашечкой кофе, в бигуди и за незашторенными окнами... Кстати, парикмахеры — очень непростые люди, они по натуре своей психологи. У меня работают сегодня 20 мастеров, и эти девушки все успешные в профессии, потому что им интересно дело, которым они занимаются. В принципе, я лояльна к своим работникам, это заграничный тренд — со-трудничество, и у нас фактически нет текучки, мы все ценим то, что имеем. Мы — классная команда! На начальном этапе, конечно, я много времени всему уделяла, а теперь всё катится спокойно по своим рельсам, которые, естественно, надо постоянно «смазывать»...

Ксения — человек спонтанный, но при том всегда всё планирует. А если человек правильный, то у него правильно всё.

Она — любящая мама троих детей. Старший сын Матвей — человек с аутизмом, и Ксения в этом видит очень значимый жизненный опыт, который многому её научил. Договориться с человеком с аутизмом сложно, здесь нужно слышать интонации собеседника и вдумываться в каждое слово. Не спешить с требованиями. Люди с аутизмом не умеют выбирать и решать, что для них лучше, потому что это для них вообще не важно. Матвею 24 года, но и сейчас приходится следить, чтобы он одевался по погоде... Между тем, Матвей уже закончил вуз.

Приоритет в общении с детьми для Ксении — их душевный комфорт. Контролировать выполнение уроков не считает важным, ведь если какие-то учебные темы дети сами не понимают, то всегда можно обратиться за консультацией к педагогам. Мама — это не контролёр, а друг. Например, Ксения — перфекционистка в быту, ей важно, чтобы всё было на своих местах, чисто и аккуратно. Но у детей в комнатах так, как нужно им, особенно бунтует против порядка средний сын-подросток, и Ксении приходится смиряться.

«А жена я нескучная!» — задорно смеётся Ксения. Замуж она вышла по любви, в их доме и сейчас живёт это трепетное чувство. Она очень благодарна мужу, хотя были разные периоды в жизни и разные взаимоотношения. Но она счастлива именно с этим человеком.

— Когда мне становилось плохо, я ему об этом говорила, и мы вместе искали выход, буквально по конкретным пунктам, — делится Ксения. — Хотя воспитание у меня совсем другое. У моей мамы были подруги, интеллигентные, образованные, которых мужья били, а сами гуляли, и они терпели. Я слушала эти разговоры на кухне и не принимала их. Почему под женской мудростью понимают это сверхужасное? У меня культа мужчины нет! Я своего мужа просто люблю, с ним советуюсь, обсуждаю то, в чём сомневаюсь. И мы вместе растим детей. Кстати, маленькая Доминика — полностью папина любовь...

«Я лояльна к своим работникам, это заграничный тренд — со-трудничество, и у нас фактически нет текучки, мы все ценим то, что имеем. Мы — классная команда!»

Для Ксении очень важно быть человеком искренним, уместным и целесообразным в поступках. Её батарейка — радость, которая возникает от самых простых вещей. Куста форзиции в ботаническом саду. Или танцующих барменов «Синей козы». Или после правильно сделанной «планки» на гимнастическом коврике. Её ничего не сдерживает и ничто не мешает ей воплощать мечты в жизнь. А мечты? Они есть всегда.

Из аккаунта Ксении:

«Старик сажал яблони. Ему сказали: "Зачем тебе эти яблони? Долго ждать с этих яблонь плодов, и ты не съешь с них яблочка". Старик ответил: "Я не съем, другие съедят, мне спасибо скажут". Лев Толстой писал гениальные произведения. И короткие, в том числе».



Фото: Александр Обухович.

Виталий Чернобрисов:

«Пусть дети бесконечно рисуют!»

Линия фронта Первой мировой войны «застряла» на белорусских землях на два с половиной года, сломав судьбы тысяч людей, разделив десятки семей. В память о том сложном времени творческие люди города Гомеля объединились для создания выставки. В её подготовке приняли участие образцовая студия «Палитра» при «Центре Инклюзивной культуры» (руководитель Василий Сидоренко), Ерёминская детская школа искусств (преподаватель Дмитрий Чак), Гомельский дворцово-парковый ансамбль, а также художники Дмитрий Ковалёв и Виталий Чернобрисов. Выставка была презентована сперва в Гомеле, а сейчас экспонируется в Минске во Дворце культуры им. Н. Ф. Шарко. В июле её планируют показать в некоторых других городах Беларуси.

О том, как проявляется тема войны в детском творчестве, как изменились рисунки детей сегодня и почему детские зарисовки нам важно сохранять, рассказал один из кураторов выставки, художник, которого называют «дедушкой белорусского авангарда», Виталий Феодосьевич ЧЕРНОБРИСОВ:

— Детское творчество — очень важная часть развития личности. До определённого возраста, лет до 12-ти, рисуют все. Когда ребёнок растёт, он познаёт окружающий мир и осваивает его через рисунок. Дети проходят историю развития человечества в своём творчестве. Сначала это «наскальные рисунки», потом примитивное искусство, а когда приходит время реализма, многие забрасывают рисование. Но творчество — это ступень интеллектуальной подготовки. Почему Япония и Китай до сих пор сохраняют каллиграфию? Они знают, что человек космичен. А искусство каллиграфии – это и процесс внутреннего постижения древней народной мудрости, и процесс самопознания. Это то, что важно для духовного развития каждого.

Виталина БАНДАРОВИЧ
Фото: личный архив В. ЧЕРНОБРИСОВА

— Ваш преподавательский стаж — более 30 лет. Как изменилось детское творчество за это время?

— Прежде всего, изменилось отношение общества. В 1970-е был расцвет детского творчества во всём мире, и в Минске тоже. В одном только Первомайском районе было восемь детских изостудий в ЖЭСах. Наши художники были активными, шли работать в кружки с большим энтузиазмом. Конечно, со временем это пошло на спад. Изменились и способы преподавания, и работы ребят. Нет ярких эмоций.

Например, девочки всегда лучше чувствуют и проявляют цвет в рисунках. Но даже у них заметно падение цветопередачи. Возможно, детей сегодня мало восхищает жизнь? Я езжу на выставки и замечаю, как их учат работать акварелью. Это сложнейшая техника. Но ребята размачивают картину, а при высыхании она выглядит бледно.

Конечно, рисунки отправляются на выставки, занимают призовые места. Выставок организуется у нас немало. Но оценивают ли у нас старания педагогов? Обязательно надо хоть как-то награждать лучших. Дело не в деньгах, а в том, что надо выделять хороших преподавателей, чтобы равнялись другие на них. Например, Василий Сидоренко и Дмитрий Чак — редкие таланты, работающие с детьми каждый более 20 лет, заслуженные педагоги. Они развили творческие способности многих ребят, и это нужно поощрять.

— Выставка памяти Первой мировой войны — интересно ли было юным художникам отображать такую непростую тему?

— Война 1914–1918 годов до сих пор остаётся «белым пятном» в нашей общей памяти. Работы учеников гомельских детских коллективов и есть попытка заглянуть в прошлое. Когда рассказываешь детям о поворотах истории, они внимательно слушают, задают вопросы. Они стараются понять эту непростую тему, а потом уже рисуют.

Мы связались с историко-культурным музейным учреждением «Гомельский дворцово-парковый ансамбль», специалисты которого предоставили нам много материалов из архивов. Оказалось, в Первую мировую у нас было немало героев, георгиевских кавалеров. Город прифронтовой, здесь госпитали принимали раненых солдат, с вокзала отправлялись на фронт войска, через Сож и Припять плыли пароходы с новобранцами. А рядом шла обычная жизнь: работали предприятия, магазины, парикмахерские, кинотеатры. До настоящего времени сохранилось здание госпиталя, и оно у многих учеников встречается в их работах.

В. Чернобрисов. 2018 г.

Чак Полина 12 лет

— Некоторые работы на выставке выполнены в чёрно-белой графике. Насколько современным детям интересен этот вид искусства?

— Детям всегда нравилась эта техника рисования. Графика, занятия пером — это непросто, это большая дисциплина. Но когда трудно, то интерес только возрастает. Так было всегда, и современные дети такие же, их захватывает сложное, то, что увлекательно постигать.

Факт

«Дедушка белорусского андеграунда» Виталий Чернобрисов устроился на работу в Художественный музей пожарным в 1972 году. Также он исполнял обязанности ночного вахтёра и подрабатывал в музее дворником. А днём Чернобрисов писал картины, которые охотно покупали коллекционеры и музеи. И только когда художнику исполнилось 75 лет, его наконец признал родной музей. Сейчас в коллекции Национального художественного музея 6 скульптур и несколько живописных работ мастера.

«Кто победит?» Гончаров Глеб, 16 лет.



— Вы повторяете родителям, чтобы они собирали и хранили рисунки своих детей, а потом показывали их своим детям… Почему это важно?

— Потому что рисунок сохраняет эмоции человека в определённый момент. И эта эмоциональная связь важна и родителям, и детям. Детские рисунки искренни и открыты, а фантазии просто удивительны. Как-то я привёз на выставку работу моего ученика, где жирафы были выше пальм. Педагоги мне сказали: «Такого не бывает!» Я отвечаю: «Конечно! Но и ковра-самолёта не бывает, и избушки на курьих ножках. Так не бывает у взрослых, а у детей — бывает». Замечательный французский художник Анри Матисс говорил, что точность не есть правда. Дети должны отображать свою правду. Своё видение мира и свои настоящие эмоции, а не продиктованные взрослыми.

Позвольте детям пробовать себя! Пусть они поют и танцуют. И бесконечно рисуют! Пальцами, кистью, карандашом — пусть творят. Все мы творцы. Только, в отличие от Бога, не можем дать произведению жизнь. Или, как Пигмалион, пробудить в камне душу. В этом наша трагедия. Но нам позволено созидать и создавать. Развивайте это — и в детях, и в себе.

В. Чернобрисов. 2016 г.

В. Чернобрисов. 2018 г.

Досье

Виталий Феодосьевич ЧЕРНОБРИСОВ — живописец, скульптор, педагог. Известен как активный деятель ленинградского андеграунда 1960–70-х и приверженец «интуитивного» письма. Знаковая фигура белорусского авангарда. Член ряда творческих объединений, в том числе художественной комиссии Музея детского творчества в Санкт-Петербурге. На благотворительных началах создал ряд скульптурных композиций в Минске, Бобруйске, Гомеле. Произведения Виталия Чернобрисова хранятся не только в частных коллекциях Беларуси, России, США, но и в различных государственных музеях: в Гомельском дворцово-парковом ансамбле, Национальном художественном музее Республики Беларусь, Третьяковской галерее, Томском художественном музее (Россия), Музее современного русского искусства в Джерси-Сити (США) и др. Более 30 лет обучал детей изобразительному искусству, им создано красочное пособие для педагогов «Красота спасёт мир».

КРЫЛЫ

Шаноўныя чытачы «Алесі»!

Па шматлікіх вашых просьбах наш часопіс распачынае новую літаратурную рубрыку. Мы назвалі яе «КРЫЛЫ». Тут вы сможаце далучыцца да прыгожага пісьменства — прачытаць вершы беларускіх паэтак і паэтаў, як вядомых, так і тых, хто не ставіць перад сабой задачы скарыць прафесійны літаратурны Алімп, але не ўяўляе жыцця без паэтычнага радка.

А можа, вы самі пішаце вершы? Дасылайце вынікі свайго творчага плёну ў рэдакцыю, на электронны адрас alesya@zviazda.by — найлепшыя з іх будуць надрукаваныя.

Жанна Усцінава

аг. Гарбавічы Чавускага раёна

Мае медуніды*

Медуначкі.
Медуначкі...
Пах дзяцінства...
М-м-мядовы!
З яблынь коўзаюць,
бы знічкі,
коцяцца па даху дома.
Оп! – адна
ў далонь упала
бокам спелым
і бліскучым –
я яе пакаштавала
з захапленнем –
ей-ей! – гучным...
Я заву вас «медуніды»,
метэоры майго саду,
і штогод
рыхтую мары
ў шораху яблыкападу!

* *Па аналогіі з Персеідамі і Леанідамі – метэорнымі патокамі з космасу*

Небавока

Пазірае на нас звысоку
задуменнае Небавока!
Не стамляецца,
не міргае –
бо павекаў яно не мае.
Ад стварэння за намі сочыць –
днямі светлымі,
цьмянай ноччу,
а як злічыць усе правіны –
зарыдае слязой дажджынай.
Як жа моташна Небавоку
з усюдыісным яго звышзрокам!
...і на мой светлы твар,
дарэчы,
крыху ўпала яго сінечы.

Елена Атай

г. Минск

После дождя

Мы когда-нибудь встретимся,
После дождя.
На залитой водой,
Родившейся вновь улице.
У скамейки беспечно целуются голуби.
Через тысячу лет,
Сразу после дождя
Я тебя поцелую.
Ты не веришь?
Всего только тысяча лет!
Для безумцев,
Сумевших друг друга найти
В разном времени,
Это не срок.
Не вспугни голубей,
Когда будешь идти
Быстрым шагом ко мне
По залитой дождём,
Родившейся вновь улице.
Я тебе благодарна за боль
И огромное счастье –
Жить с тобою
На этой земле.
Знать, что мы будем вечно,
Что встретимся снова.
Сразу после дождя.
...через тысячу лет.

Таіса Роліч

г. п. Падсвілле Глыбоцкага раёна

***

Мая душа імкнецца на прасторы
Старонкі любай – родных хутароў,
У маленства кут, жыло дзе шчасця мора,
Свяціўся сонцам кожны чабарок.

Дзе сцежка ледзь прыкметная праз поле
Вяла наўпрост на вузенькі прасцяг.
Маё карэнне тут і продкаў доля,
Выток ракі жыцця на зорны шлях.

Вякоў дыханне чуецца ў зацішку
Сярод прастораў родных берагоў.
Спяваюць птушкі меладычна-ціха,
Каб не парушыць вечны сон бацькоў.

Тут рай душы, збавенне ад спакусаў
Пустых жыццёвых гонаў за рублём.
...Заціх гармонік, скрыпка, жальба гусляў.
Сады старэюць, долу гнуць галлё.

А маладыя дрэўцы падрастаюць,
Жыццё ўслаўляе пошчак салаўя.
Растуць лясы, да вёскі падступаюць.
Надзеяй новай дыхае зямля.

Малюнкі Лілі АБРАЗЕЙ.

Марина Шадуя

г. Брест

Фантазёрка

Фантазёркой сызмальства я была.
Всё казалось мне, что могу, умею
Со звездой болтать на краю села,
Расписать рассвет в яркий цвет шалфея.

И в тугую косу сплетать дожди,
Рисовать на небе полоски радуг...
Хочешь, будем вместе теперь бродить
Босиком по лужам?
Мне очень надо,

Чтобы кто-то на ухо нашептал,
Что всё это правда, не разучилась...
Тишина в ответ.
Значит, мой причал
Нынче снова пуст.
И грустят светила.

Молча смотрят с неба, боясь упасть,
Оказаться пылью и камнепадом.
Им нужны, как людям, любовь и страсть,
И чтоб тот, кто верит, всегда был рядом.



У гародзе лебяда – гаспадыні не дяда

Гатуем стравы з пустазеллем

Для тых, хто мае дачу і ўласны агарод, надышоў час змагання з пустазеллем. Аднак будзем уважлівыя да некаторых раслін: лебяда, крапіва, снітка, агурочнік і дзьмухаўцы — з іх можна прыгатаваць смачныя стравы.

Расказвае этнограф Ларыса Мятлеўская

Спрадвеку ў гаспадарчых справах паміж гаспадаром і гаспадыняй на вёсцы існаваў даволі строгі падзел. Сферай дзейнасці мужчыны (у якую жанчына не ўмешвалася, а толькі супрацоўнічала) з'яўляліся поле, луг, гумно, догляд за цяглавай жывёлай (коні, валы), выраб і рамонт усіх гаспадарчых прылад, будоўля і іншыя, больш дробныя працы. Жанчына затое адзінаўладна ўпраўлялася ў хаце і агародзе, даглядала хатніх жывёл і птушнік, даіла карову, жала жыта, вырабляла тканіны і адзенне з іх і шмат што іншае. Як казалі, «жаночай работы рабіць — не перарабіць»! Мужчына таксама дапамагаў ёй, але нашмат меней. Пра тое ў народзе такая показка была: «Мужык у жаночае рабоці столькі паможэ, сколькі кот наплачэ, не то што ена, гарутніца».

Чужакоў і дзяцей не пускаць!

Звычайна ў агародзе выдзялялася асобна градка ў зацішным, сонечным месцы — пад высеўкі. Так называліся караняплоды і капуста з коранем, пасаджаныя для атрымання насення. Гэта цяпер, каб купіць пачак насення, мы ідзём у краму, а хадавыя культуры — агуркі, таматы, радыску — можна набыць у любым супермаркеце. А даўней гаспадыні вырошчвалі насенне самастойна.

З гэтай нагоды ўзгадаўся выпадак з дзяцінства. Было мне гадоў 5–6, калі аднойчы, на пачатку лета, ускочыўшы чагосьці ў агарод, вырвала вялікую морквіну і з гонарам панесла яе да бабулі, як сапраўдная памочніца. Вой, і ляманту тады было! Аказваецца, я адным махам пазбавіла бабулю насення моркві на наступны год.

Фота Ларысы МЯТЛЕЎСКАЙ

І ўсё ж, калі такое здаралася і насенне па нейкай прычыне не выспявала, то яго можна было сімвалічна купіць у суседкі або сваячкі. За жменю насення плацілі манетнай дробяззю, абавязкова прыгаворваючы: «Каб вялося і не звялося».

А што тычыцца малых дзяцей, то пускаць іх у агарод было не прынята па ўсёй Беларусі. Маўляў, чаго таптацца па градах? Прысутнасць чужых людзей на агародзе таксама была непажаданай. Лічылася, што ліхое вока можа пашкодзіць здаровому росту раслін і будучаму ўраджаю. На Століншчыне мне распавядалі, як маці, ідучы ў калгас на працу, выбірала ў падол фартуха салодкіх агуркоў і пакідала іх для дзяцей, якія ласаваліся імі да вечара, а на грады ім самім ісці катэгарычна забаранялася!

Як абаранялі агарод ад шкоднікаў

Ад канца красавіка і на працягу мая гаспадыня шчыравала ў агародзе. Парабіўшы грады, сеяла на іх звыклыя для нашай зоны культуры. Звычайна акрамя абавязковай бульбы вырошчвалі капусту, моркву, буракі, рэпу, рэдзьку, бручку, боб і фасолю, салодкі гарох, кукурузу, цыбулю і часнок, агуркі і гарбузы, зрэдку — салату і пятрушку, кроп і каляндру. Асобна сеялі мак, насенне якога выкарыстоўвалі ў выпечцы і ў прыгатаванні посных страў.

Акрамя таго, гаспадыня мусіла быць гатовай да процістаяння такім з'явам, як веснавыя замаразкі, засуха, вераб'і, уласныя і суседскія куры, краты, блошкі, вусені, а таксама... свінні. У замаразкі расліны з раніцы апырсквалі вадой, каб змыць іней, у засуху цягалі штовечар вёдры з сажалак і шчодра палівалі грады. Супраць вераб'ёў ставілі страшыдлы (пудзіла), супраць вусеняў, тлі і блошак пасыпалі расліны попелам, апырсквалі настоямі горкага палыну і піжмы, а таксама садзілі побач антаганістаў: напрыклад, каля морквы садзілі часнок, у радках паміж цыбуляй сеялі рэдзьку. Добрай абаронай для шматлікіх насякомых шкоднікаў былі каноплі, якія ў невялікай колькасці наўмысна садзілі сярод градак.

Лебяда — сваячка шпіната

Палолі агарод ад мая і да жніва. Заўсёды ўзгадваю бабуліну прыказку: «Калі ў гародзе лебяда — гаспадыні не бяда, а як брыца ды макрыца, памажы ты мне, сястрыца!» І сапраўды, на ўрадлівых глебах лебяда — а гэта вельмі блізкая сваячка шпіната — расце буйная, з сакавітым лісцем. У даўнія часы лебяда вырошчвалася як агародная культура. Калі пагартаць старадаўнія кулінарныя кнігі, можна вышукаць нямала кулінарных рэцэптаў страў, у складзе якіх красуецца лебяда. Напрыклад, першая кулінарная кніга «Літоўская кухарка» Вінцэнты Завадскай у меню на чэрвень штодня прапануе шмат цікавых страў, сярод якіх ёсць і смаката з лебядой. Дзівіцеся і спрабуйце прыгатаваць самі!

Тушанка з лебяды

Інгрэдыенты: *800 г лебяды (або шпінату)* ❖ *1 сталовая лыжка мукі* ❖ *1 сталовая лыжка алею* ❖ *1 шклянка булёну або малака* ❖ *1 чайная лыжка цукру.*

Як гатаваць: лебяду ці шпінат перабраць і добра памыць, адлучыўшы ад карэнчыкаў, абтрэсці ад вады. Укінуць у кіпячую падсоленую ваду. Як стане мяккай, перакласці ў халодную ваду, апаласнуць, адціснуць і працерці праз сіта. Распусціць лыжку масла, змяшаць з такой жа колькасцю мукі. Развесці булёнам або малаком і закіпяціць. Пакласці ў гэтую вадкасць шпінат або лебяду, перамяшаць, пасаліць і пасаладзіць, моцна нагрэць, але не кіпяціць, бо страва счарнее.

Падаць з падсмажанымі грэнкамі, выпускнымі яйкамі, амлетам або падсмажанай цялячай пячонкай.

Магчыма, вы здзівіцеся, але для прыгатавання гэтай стравы можна выкарыстаць бацвінне радыскі, салаты або маладой крапівы. Толькі ў гэтым выпадку разводзіць страву трэба не малаком, а булёнам.

Гэтая страва тычыцца шляхецкай кухні, а вось на вёсцы лебяду дадавалі разам са шчаўем і маладой бурачнай націнай у першыя стравы, якія варылі як посныя, так і на костцы.

Пірагі з лебядой

Умаёй сям'і часам пяклі пірагі, у сярэдзіне якіх была лебяда, вараныя яйкі і смажаныя на алеі цыбуля з грыбамі. Бабуля была з заможнай сям'і, і такія пірагі былі ўспамінам пра яе дзяцінства.

Лебяду тушылі на масле або алеі да мяккасці і крышылі, асобна смажылі вараныя сухія грыбы з цыбуляй, усё разам з яйкам перамешвалі, салілі і дадавалі здробнены зялёны кроп. Раней цеста бралася дражджавое, але смачна атрымліваецца і са слаёным. Калі ж лянота ўчыняць цеста, то можна ў краме купіць гатовае ці выкарыстаць выпечаныя каржы і нават лаваш. Праўда, гэта будзе ўжо нешта новае, але ж хто нам на сваёй кухні забароніць? Калі бабулі бракавала часу, яна замест цеста пякла тоўстыя бліны, якія перакладала начынкай і пакідала на час пад сурвэткай. З'ядалася ўсё хутка, і ніякіх нараканняў не было.

Пельмені з зелянінай

Інгрэдыенты: *2 шклянкі мукі ❖ палова шклянкі соку з крапівы, сніткі, лебяды ❖ соль — на смак.* ***Для фаршу:*** *па 100 г здробненай сумесі лебяды, крапівы і сніткі ❖ 100 г мяснога фаршу ❖ чорны молаты перац ❖ соль.*

Як гатаваць: Травы прамыць, здрабніць і адціснуць сок. Мясны фарш змяшаць з травой, пасаліць і паперчыць. Старанна вымесіць. Цеста для пельменяў раскатаць у тонкі пласт. Шклянкай выразаць кружкі, пакласці начынне. Сфармаваць пельмені. Варыць у кіпячай падсоленай вадзе 5–7 хвілін. Дадаць масла, смятану, здробненую зеляніну пятрушкі і кропу.

Беларускія халаднікі

Для лета нам звыклыя халодныя супы. Беларускія кухары і кухаркі любілі фантазіраваць і прыдумалі шмат варыяцый на гэтую тэму.

Халаднік з агурочнага расолу

Каб прыгатаваць халаднік для аматараў «чаго-небудзь салёненькага», вам спатрэбіцца 1 л агурочнага расолу, 2-3 вараныя яйкі, 400 г вады, 2 свежыя агуркі, пер'е цыбулі, жменя зялёнага кропу, некалькі кветак агурочнага пустацвету і 200 г смятаны.

У агурочны расол дадаць дробна пакрышаныя агуркі, цыбулю, кроп. Калі расол вельмі салёны, яго можна развесці вадой. Перад падачай у талерку трэба пакрышыць варанае яйка, дадаць смятаны і ўпрыгожыць страву кветкамі агурочнага пустацвету.

Халаднік з кіслага малака

Не вельмі адрозніваецца па інгрэдыентах ад свайго агурочнага брата халаднік з кіслага малака. У ім крыху менш складнікаў: толькі кіслае малако, зялёная цыбуля, агурок, вараныя яйкі і кроп. Многія не разумеюць, як можна спалучаць свежую агародніну з малочнымі прадуктамі, але варта паверыць: гэта сапраўдная смаката. Хрумсткія агуркі і мяккі малочны смак не пакінуць абыякавым нікога.

Халаднік з лебяды і шчаўя

Інгрэдыенты: *200 г шчаўя ❖ 200 г лебяды ❖ 500 г бульбы ❖ 100 г цыбулі рэпчатай ❖ 3 л вады ❖ 50 г морквы ❖ соль — на смак.*

Як гатаваць: бульбу ачысціць, нарэзаць кубікамі і адварыць. Шчаўе і лебяду дробна парэзаць, пасераваць разам з цыбуляй і морквай на раслінным алеі, затым пакласці ў бульбяны адвар. Размяшаць і кіпяціць яшчэ каля 5 хвілін. Пасаліць, ужываць можна як гарачым, так і халодным, са смятанай і без.

Халаднік са шчаўя

Інгрэдыенты: *шчаўе ❖ снітка ❖ пер'е цыбулі ❖ малады кроп ❖ агурочнік або зялёны агурок ❖ яйка ❖ смятана і соль — на смак.*

Як гатаваць: усю зеляніну неабходна памыць, перабраць і пакрышыць. Шчаўе — яго трэба ўзяць больш, чым астатняй зеляніны, — і снітку (толькі маладыя парасткі) зварыць у падсоленай вадзе і астудзіць. Дадаць крышаную цыбулю, агурочны ліст або агурок, кроп і варанае яйка. Халаднік забяліць смятанай. Ядуць страву з варанай бульбай або хлебам.

Тэма жаночай занятасці і жаночага прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці сёння значыцца ў ліку найбольш актуальных. Перш за ўсё таму, што менавіта на жаночай ініцыятыве грунтуецца будучыня сельскага турызму і народных рамёстваў. Многія краіны Еўропы ўжо прайшлі гэты шлях, і мы маем цяпер масу прыкладаў і мадэлей развіцця. Але нават самы лепшы замежны вопыт трэба здолець ажыццявіць у нашых умовах, напоўніць мясцовым зместам. А для гэтага трэба знайсці ініцыятыўных жанчын і падтрымаць іх памкненні.

Чаго хочуць жанчыны? Быць паспяховымі!

Мінулай восенню быў заяўлены сацыяльны праект «Падтрымка жанчын у фермерстве, аграгурызме і рамесніцтве», рэалізуюць яго грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» ў партнёрстве з Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам пры фінансавай падтрымцы «The Coca-Cola Foundation». Больш за 400 жанчын Берасцейшчыны прайшлі бізнес-навучанне і атрымалі індывідуальныя кансультацыі. Трэнінгі адбыліся ў Брэсце, Маларыце, Камянцы, Кобрыне, Баранавічах, Пінску. Тэарэтычная частка праекта ўключала дасканалае знаёмства з юрыдычнымі і фінансавымі аспектамі. На вэбінарах закраналіся такія тэмы, як «Гісторыя беларускай кухні», «Мясцовыя гастранамічныя брэнды», «Сацыяльныя сеткі як інструмент прасоўвання бізнесу», «Сакрэты шляху да поспеху маленькімі крокамі» і інш.

А потым сярод удзельніц быў праведзены конкурс бізнес-ініцыятыў. Аргкамітэт атрымаў 89 заявак, з іх выбраны 50 лепшых. Прадстаўленыя праекты былі крэатыўнымі і разнастайнымі: ад лялечнага тэатра — батлейкі, сямейнай зефірнай майстэрні, міні-пякарні да гадоўлі паўлінаў, нарыхтоўкі мёду з хваёвых шышак або снэкаў з гарбузоў.

Рэалізацыя праектаў ужо пачалася, у верасні плануецца ўбачыць некаторыя вынікі. Аўтары найлепшых бізнес-ініцыятыў атрымалі фінансаванне на набыццё абсталявання і расходных матэрыялаў для станаўлення ўласнага бізнесу.

Надзея СУСЛАВА
Фота аўтара
і з сацыяльных сетак

Вопыт

Імя кобрынскай краўчыхі і дызайнера Марыны Баніфацьевай вядомае сёння не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Матушка Марына — жонка настаяцеля царквы Святога Іаана Прадцечы, што ў аграгарадку Хідры Кобрынскага раёна. Яе сённяшні дызайнерскі поспех пачаўся амаль 20 гадоў таму з царкоўнага шыцця — а менавіта з жадання прыгожа апрануць мужа для набажэнстваў. Уборы айца Андрэя спадабаліся іншым святарам, матушка стала шыць вопратку таксама і для іх, асвоіла вышыўку ў розных тэхніках. Нават і ўявіць не магла, чым можа скончыцца яе ініцыятыва. Зараз расшытае матушкай Марынай царкоўнае адзенне можна ўбачыць у праваслаўных храмах Расіі, Украіны, Польшчы, Эстоніі, Германіі, Італіі, Швейцарыі, Канады, ЗША.

Затым Марына Баніфацьева пачала шыць і ўпрыгожваць вышыўкай у народным стылі жаночыя сукенкі, спадніцы, кашулі. Першы час яна апранала выключна ўдзельнікаў мастацкіх калектываў. Але нечакана змянілася мода — і з'явілася цікавасць да такой самабытнай вопраткі ў звычайных жанчын. Марына ўжо цудоўна валодала майстэрствам шыцця і аздаблення рознага адзення, яна стала выпускаць свае калекцыі, прымаць удзел у модных паказах. Была адзначана дыпломам на Беларускім тыдні моды. «Галоўнае — верыць у свае сілы, не баяцца пачынаць сваю справу ў любым узросце», — дзялілася падчас бізнес-трэнінгу асабістым вопытам майстар.

Каментарыі

Ірына ФЕДЧЫК, намесніца старшыні Камітэта па працы і сацыяльным забеспячэні Брэсцкага аблвыканкама:

— Праект вельмі патрэбны і актуальны. Хочацца падзякаваць арганізатарам за змястоўныя трэнінгі па асноўных аспектах самазанятасці. Радуе, што жанчыны нашай вобласці праявілі столькі актыўнасці. І як вынік — 50 цікавых, грунтоўных бізнес-ініцыятыў, якія абапіраюцца на мясцовую культуру і рэгіянальныя асаблівасці. Спадзяюся, што гэты конкурс для многіх удзельніц стане пачаткам паспяховай прадпрымальніцкай і рамеснай дзейнасці, паспрыяе пашырэнню паслуг у сферы сельскага турызму.

Валерыя Кліцунова, старшыня БГА «Адпачынак у вёсцы»:

— Не сакрэт, што ў сельскага турызму — жаночы твар. Наш праект накіраваны на прасоўванне магчымасцей жанчын па ўдзеле іх у прадпрымальніцтве, на прыцягненне іх да заняткаў традыцыйнымі рамёствамі і нацыянальнай кухняй, што ў выніку будзе спрыяць павелічэнню даходу іх сем'яў. Вельмі ўдзячная ўсёй нашай камандзе, нашаму галоўнаму партнёру — Брэсцкаму аблвыканкаму, нашаму спонсару — дабрачыннаму фонду «The Coca-Cola Foundation». Наша зладжаная праца — гэта ключ да поспеху. І, вядома, мяне вельмі радуюць сельскія жанчыны, для якіх праект быў задуманы. Яны прадэманстравалі сапраўдны запал, ім вельмі важна ўсе свае ідэі ажыццявіць, здзейсніць задуманае. Няхай жа ў нашых удзельніц з'явіцца любімая справа, якая будзе прыносіць ім творчае задавальненне, а яшчэ карысць сям'і і грамадству.

ТОП-10 найлепшых бізнес-праектаў

1 Зоя Неліповіч, гаспадыня аграсядзібы «Калінка-2», жыве ў вёсцы Голы Барок, дзе на аднаго жыхара прыпадае 5 пчаліных сем'яў. У апошнія гады пчолы часта гінуць з-за выкарыстання хімікатаў на палях, а якасць белавежскага мёду пагаршаецца. Таму Зоя прапанавала высадзіць у кожным двары «дрэва XXI стагоддзя» — паўлоўнію. Гэтая расліна вядомая тым, што стварае экалагічны баланс. Буйное лісце добра чысціць паветра ад выхлапных газаў і іншых шкодных рэчываў, а каранёвая сістэма здольная паглынаць значную колькасць хімікатаў і цяжкіх металаў, чысцячы ад іх глебу. Паўлоўнія лічыцца адным з самых хуткарослых дрэў у свеце, за год вырастае на 3-5 метраў, акрамя ўсяго мае буйную крону і вельмі меданосную кветчень. Лічыцца, што адно дрэва замяняе 1 га пасяўных меданосных траў; яно квітнее 1,5 месяца, а якасць мёду з паўлоўніі канкурыруе з акацыевым мёдам. Драўніна паўлоўніі вельмі лёгкая і трывалая, з прыгожым малюнкам і прыемным серабрыста-карычневым колерам, валодае выдатнымі акустычнымі ўласцівасцямі — з яе вырабляюць музычныя інструменты, спартыўны інвентар, а таксама звыштонкі шпон таўшчынёй з газетную паперу. Вынік ініцыятывы — стварыць цэнтр па вырошчванні культуры паўлоўніі ў Белавежы. Высадзіўшы дрэвы-меданосы, Зоя марыць ператварыць вёску Голы Барок у квітнеючы рай — прывабны для турыстаў, дзе слоічак паўлоўніевага мёду будзе візітоўкай і выдатным сувенірам для гасцей.

2 Наталля Лімарэнка з аграгарадка Турна Вялікая, што ў Камянецкім раёне, збіраецца адкрыць вытворчасць крэм-мёду «Мроя» па канадскай тэхналогіі з даданнем вырашчаных на ўласным участку ягад, садавіны і гародніны. Мэта гэтай ініцыятывы — выраб мясцовых экалагічна чыстых прадуктаў. Крэм-мёд — гэта натуральны харчовы прадукт, які атрымліваецца пры доўгім ўзбіванні пчалінага мёду, па жаданні – з дабаўленнем раслінных выцяжак. У выніку такога тэхналагічнага працэсу атрымліваецца лёгкая пластычная кансістэнцыя, а пры захоўванні крэм-мёд не зацукроўваецца.

3 Алена Бандарэвіч з Лунінецкага раёна плануе распачаць вытворчасць дамашняга зефіру на аснове натуральных інгрэдыентаў з уласнага саду і з дабаўленнем прыродных кампанентаў. Ключавымі канкурэнтнымі перавагамі яе прадукту з'яўляюцца не толькі натуральнасць, але і разнастайнасць формы вырабаў. Да прыкладу, мяркуецца вырабляць зефірныя кветкі і букеты з іх. Будзе развівацца такі крэатыўны накірунак, як зефірная фларыстыка. Ужо сёння выконваюцца заказы на ружы з зефіра, ласункавы бэз і кампазіцыі з некалькіх салодкіх кветак. Акрамя таго, што будзе папаўняцца асартымент, гаспадыня стварае ўласныя варыянты рэцэптуры.

